**Копія**

# РАШЭННЕ
# ІМЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Віцебск 01 ліпеня 2016 года

Віцебскі абласны суд у складзе: старшынствуючага суддзі Федзюкевіча Аляксандра Іосіфавіча, пры сакратару Казлоўскай Алене Паўлаўне, з удзелам пракурора Цітковай Ірыны Мікалаеўны,

прадстаўнікоў зацікаўленых асобаў: Смолікава К.Э., Бутарава А.В., Чарыевай О.Х.,

разгледзеўшы ў адкрытым судовым пасяджэнні ў памяшканні Віцебскага абласнога суда грамадзянскую справу па скарзе Партыі БНФ на сумеснае рашэнне Прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта па фарміраванні складу Віцебскай абласной выбарчай камісіі і акруговых выбарчых камісій у Віцебскай вобласці па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання,

устанавіў:

у скарзе суду заяўнік указаў, што рашэннямі кіруючага органа Партыі БНФ (Сойм) ад 18 чэрвеня 2016 года на падставе артыкула 35 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь ў склад тэрытарыяльнай і акруговых выбарчых камісіяў па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання ў Віцебскай вобласці былі вылучаны сябры Партыі БНФ:

у Віцебскую абласную выбарчую камісію - Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч; у акруговую выбарчую камісію Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18 - Янушкоўскі Аляксандр Уладзіміравіч; у акруговую выбарчую камісію Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акругі №19 - Кійко Уладзімір Іванавіч; у акруговую выбарчую камісію Віцебскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №20 - Кійко Адэліна Іванаўна; у акруговую выбарчую камісію Гарадоцкай выбарчай акругі №21 - Аўчыннікава Алена Леанідаўна.

Нягледзячы на тое, што ўсе яны валодаюць вялікім досведам удзелу ў выбарчых кампаніях і ўсімі арганізацыйнымі і прафесійнымі здольнасцямі для таго каб выконваць функцыі сябра выбарчай камісіі, сумесным рашэннем Прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 27 чэрвеня

2016 года Партыі БНФ было адмоўлена ва ўключэнні названых прадстаўнікоў у склад Віцебскай абласной выбарчай камісіі і адпаведных, пазначаных вышэй, акруговых выбарчых камісіяў.

Спасылаючыся на незаконнасць названага рашэння, парушэнне правоў Партыі БНФ, а таксама правоў і законных інтарэсаў вылучаных грамадзян, прасіў:

1) прызнаць рашэнне Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і Прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў ад 27 чэрвеня 2016 года незаконным і парушаючым правы заяўніка;

2) абавязаць Віцебскі абласны выканаўчы камітэт і Прэзідыум Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў прыняць новае рашэнне аб фарміраванні Віцебскай абласной выбарчай камісіі і акруговых выбарчых камісіяў у Віцебскай вобласці з уключэннем у іх склад прадстаўнікоў Партыі БНФ: у Віцебскую абласную выбарчую камісію - Смолікава Канстанціна Эдуардавіча; у акруговую выбарчую камісію Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18 - сябра Партыі БНФ Янушкоўскага Аляксандра Уладзіміравіча; у акруговую выбарчую камісію Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акругі №19 - сябра Партыі БНФ Кійко Уладзіміра Іванавіча; у акруговую выбарчую камісію Віцебскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №20 - сябра Партыі БНФ Кійко Адэліны Іванаўны; у акруговую выбарчую камісію Гарадоцкай выбарчай акругі №21 - сябра Партыі БНФ Аўчыннікавай Алены Леанідаўны.

У судовым пасяджэнні прадстаўнік Партыі БНФ Смолікаў К.Э. заяўленую скаргу падтрымаў.

Прадстаўнікі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Бутараў О.В. і Чарыева О.Х., прасілі пакінуць скаргу без задавальнення, мяркуючы, што рашэнне прынята ў адпаведнасці з законам.

Заслухаўшы тлумачэнні бакоў, даследаваўшы пісьмовыя матэрыялы справы, заслухаўшы меркаванне пракурора аб неабходнасці адмовіць у задавальненні скаргі, суд лічыць, што скарга не падлягае задавальненню па наступных падставах.

У адпаведнасці з аб.1 ч.1 арт.34 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей ВК) абласныя тэрытарыяльныя і акруговыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, сфарміраваныя з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы, утвараюцца прэзідыумамі абласных Саветаў дэпутатаў і абласнымі выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9-13 членаў камісіі не пазней, чым за 75 дзён да выбараў.

Па правілу частак 2, 3, 4 гэтага ж артыкула органы, якія ўтвараюць камісію, як правіла, не менш адной трацiны яе складу фарміруюць з прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. У склад камісіі не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Дзяржаўныя служачыя не могуць складаць больш за адну трацiну складу камісіі.

Згодна з ч.5 арт. 34 ВК сумесныя рашэнні прэзідыума адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта прымаюцца большасцю галасоў складу. У сумесным пасяджэнні гэтых органаў павінны ўдзельнічаць не менш як дзве трэці складу прэзідыума мясцовага Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта. На пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.

Па справе ўстаноўлена, што Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 06 чэрвеня 2016 года № 190 на 11 верасня 2016 года прызначаны выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Распараджэннем першага намесніка старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта № 197р ад 06 чэрвеня 2016 года ў выканкаме арганізаваны прыём і рэгістрацыя дакументаў па вылучэнні прадстаўнікоў у склад Віцебскай абласной і акруговых выбарчых камісій.

24 чэрвеня 2016 года вылучэнне прадстаўнікоў у склад Віцебскай абласной і акруговых выбарчых камісій скончаны.

На падставе пунктаў 1 і 2 часткі восьмай артыкула 24, абзацаў другога і трэцяга часткі першай артыкула 34 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь пастановай прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 27 чэрвеня 2016 г. № 29 \ 369 у Віцебскай вобласці былі ўтвораны Віцебская абласная і 14 акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

З матэрыялаў справы вынікае, што сумеснае рашэнне аб утварэнні абласной і акруговых выбарчых камісій прынята правамоцным органам, у вызначаны законам тэрмін, у прысутнасці прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.

Выкладзенае пацверджана тлумачэннямі бакоў, копіяй распараджэння аб прыёме дакументаў, спісамі асоб вылучаных у склад

выбарчых камісій, копіяй пастановы прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 27 чэрвеня 2016 г. № 29 \ 369, пратаколам сумеснага пасяджэння названых органаў, спісамі членаў прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць сёмага склікання і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Не давяраць звесткам, названым у дадзеных дакументах, у суда падстаў не маецца.

Довады заяўніка аб тым, што пры фарміраванні Віцебскай абласной выбарчай камісіі, а таксама камісій: Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18, Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акругі №19, Віцебскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №20, Гарадоцкай выбарчай акругі №21 не былі выканаваны патрабаванні выбарчага закона, парушаны правы сяброў Партыі БНФ, матэрыяламі справы не пацверджаны.

У судовым пасяджэнні ўстаноўлена, што ў склад Віцебскай абласной выбарчай камісіі быў вылучаны 21 прадстаўнік, у тым ліку ад грамадскіх арганізацый - 9, ад грамадзян шляхам падачы заявы - 6, ад партый - 5, ад працоўных калектываў - 1. Склад камісіі сфарміраваны з 13 членаў, у максімальным памеры, прадугледжаным выбарчым законам.

Выбраны склад Віцебскай абласной выбарчай камісіі складаецца з 3 прадстаўнікоў партый і 6 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, або 69,2% ад агульнай колькасці складу камісіі, 3 прадстаўнікоў ад грамадзян шляхам падачы заявы, 1 прадстаўніка ад працоўнага калектыву. У склад камісіі абраны 1 дзяржаўны служачы. Суддзяў, пракурораў, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у складзе камісіі няма.

У склад выбарчай камісіі Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18 было вылучана 26 прадстаўнікоў, у тым ліку ад партый - 4, ад грамадскіх арганізацый - 8, ад грамадзян шляхам падачы заявы - 12, ад працоўных калектываў - 2. Склад камісіі сфарміраваны з 13 членаў, у максімальным памеры, прадугледжаным выбарчым законам.

Выбраны склад выбарчай камісіі Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акругі №18 складаецца з 1 прадстаўніка партыі і 4 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, што складае не менш адной траціны, 6 прадстаўнікоў ад грамадзян шляхам падачы заявы, 2 прадстаўнікоў ад працоўных калектываў.

У складзе камісіі няма дзяржаўных служачых, суддзяў, пракурораў, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

У склад выбарчай камісіі Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акругі №19 было вылучана 20 прадстаўнікоў, у тым ліку ад партый - 4, ад грамадскіх арганізацый - 7, ад грамадзян шляхам падачы заявы - 7, ад працоўных калектываў - 2. Склад камісіі сфарміраваны з 13 членаў, у максімальным памеры, прадугледжаным выбарчым законам.

Выбраны склад выбарчай камісіі Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акругі №19 складаецца з 2 прадстаўнікоў партый і 4 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, што складае 46,2% ад агульнай колькасці членаў камісіі, 5 прадстаўнікоў ад грамадзян шляхам падачы заявы, 2 прадстаўнікоў ад працоўных калектываў.

У склад камісіі абраны 1 дзяржаўны служачы. Суддзяў, пракурораў, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у складзе камісіі няма.

У склад выбарчай камісіі Віцебскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №20 было вылучана 18 прадстаўнікоў, у тым ліку ад партый - 4, ад грамадскіх арганізацый - 8, ад грамадзян шляхам падачы заявы - 5, ад працоўнага калектыву - 1. Склад камісіі сфарміраваны з 13 членаў, у максімальным памеры, прадугледжаным выбарчым законам.

Выбраны склад выбарчай камісіі Віцебскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі №20 складаецца з 2 прадстаўнікоў партый і 5 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, што складае 53,8% ад агульнай колькасці членаў камісіі, 5 прадстаўнікоў ад грамадзян шляхам падачы заявы, 1 прадстаўніка ад працоўнага калектыва.

У складзе камісіі таксама няма дзяржаўных служачых, суддзяў, пракурораў, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

У склад выбарчай камісіі Гарадоцкай выбарчай акругі №21 было вылучана 20 прадстаўнікоў, у тым ліку ад партый - 4, ад грамадскіх арганізацый - 8, ад грамадзян шляхам падачы заявы - 7, ад працоўнага калектыву - 1. Склад камісіі сфарміраваны з 13 членаў, у максімальным памеры, прадугледжаным выбарчым законам.

Выбраны склад выбарчай камісіі Гарадоцкай выбарчай акругі №21 складаецца з 1 прадстаўніка партыі, 7 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, што складае 61,5% ад агульнай колькасці членаў камісіі, 4 прадстаўнікоў ад грамадзян шляхам падачы заявы, 1 прадстаўніка працоўнага калектыву.

У склад камісіі абраны 4 дзяржаўныя служачыя, што складае 30,8% ад агульнай колькасці членаў камісіі і не перавышае адну траціну. Суддзяў, пракурораў, кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у складзе гэтай камісіі няма.

Названыя абставіны пацверджаны дапушчальнымі пісьмовымі дакументамі, сумнявацца ў пэўнасці якіх у суда падстаў не маецца.

Сцвярджэнні прадстаўніка Партыі БНФ пра тое, што прынятым рашэннем былі ўшчэмлены правы членаў партыі, з'яўляюцца неабгрунтаванымі.

З матэрыялаў справы відаць, што заява Партыі БНФ ва ўстаноўленым парадку было прынята, названыя імі кандыдатуры былі пастаўлены на галасаванне і большасцю галасоў адхілены.

Больш за тое, з тлумачэнняў бакоў, матэрыялаў справы вынікае, што ў склад акруговай выбарчай камісіі Віцебскай-Горкаўскай выбарчай акругі № 17 тады ж быў абраны іншы вылучаны Партыяй БНФ прадстаўнік - Магутная Г.Е.

Пры наяўнасці такіх дадзеных суд прыходзіць да высновы пра тое, што пры стварэнні выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь парушэнняў выбарчага заканадаўства не маецца, а таму скарга заяўніка задавальненню не падлягае.

Кіруючыся арт. 302 ГПК Рэспублікі Беларусь, суд

В Ы Р А Ш Ы Ў:

Пастанову прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 27 чэрвеня 2016 г. № 29 \ 369 Аб стварэнні Віцебскай абласной, акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання пакінуць без змены, а скаргу Партыі БНФ - без задавальнення.

Рашэнне ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння і абскарджанню (апратэставанню) ў касацыйным парадку не падлягае.

Старшынствуючы
суддзя Віцебскага
абласнога суда (Подпіс) А.І. Федзюкевіч

Сапраўдна:
суддзя Віцебскага
абласнога суда А.І. Федзюкевіч

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ СУД